# АСАБЛІВАСЦІ ДРУГОГА ЭТАПА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ Ў ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЯХ БССР ПА МАТЭРЫЯЛАХ МАЛАДЗЕЧАНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**А. А. Мядзведзева**

*sasha100965@gmail.com;*
*Навуковы кіраўнік – А. Г. Каханоўскі, доктар гістарычных навук, прафесар*

У артыкуле паказаны асаблівасці другога этапа калектывізацыі ў заходніх абласцях Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Другі этап калектывізацыі адбываўся ў 1949–1953 гг. і характарызаваўся правядзеннем масавай калектывізацыі і ўзбуйненнем калгасаў. Трэба адзначыць, што дадзены этап завершыў калгаснае будаўніцтва ў Заходніх абласцях Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і даў пачатак новаму этапу ў жыцці заходніх абласцей Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

***Ключавыя словы***: другі этап калектывізацыі; заходнія вобласці БССР; масавая калектывізацыя; узбуйненне калгасаў; Маладзечанская вобласць; 1949–1952 гг.

Другі этап калектывізацыі ў заходніх абласцях БССР адбываўся ў 1949–1952 гадах. На пачатак 1949 года ўжо былі створаны перадумовы для больш маштабнага і хуткага працэса калектывізацыі ў заходніх абласцях БССР. У лютым 1949 года адбыўся XIX з’езд Камуністычнай партыі Беларусі, які паставіў перад партыйнымі арганізацыямі БССР задачу ажыццяўлення масавай калектывізацыі сялянскіх гаспадарак [1, с. 94].

У другой палове 1948 г. у заходніх абласцях БССР значна ўзмацнілася калектывізацыя сялянскіх гаспадарак, а ў сакавіку 1949 года яна стала нарастаць. Па стане на 01.07.1948 г. у заходніх абласцях БССР было 330 калгасаў, якія аб'ядноўвалі 11476 гаспадарак [2], а па дадзеных ад 15.03.1949 г. у заходніх абласцях БССР было створана 1420 калгасаў, якія аб'ядноўвалі 59762 гаспадаркі. Працэнт калектывізацыі склаў 10 % у цэлым па краіне. У Маладзечанскай вобласці – 12 %. Да зімы 1949 года тэмпы калектывізацыі пастурпальна ўзрасталі. Было створана 4210 калгасаў і працэнт каектывізацыі склаў 35 % [3].

У 1950 годзе тэмпы калектывізацыі ў заходніх абласцях БССР вельмі хутка ўзрасталі. Па стане на 15.01.1950 г. у заходніх абласцях БССР налічвалася 4914 калгасаў, а працэнт калектывізацыі склаў 40,6 %. А праз год, па дадзеных ад 01.01.1951 г., у заходніх абласцях БССР было створана 6054 калгасы і працэнт калектывізацыі склаў 83,7 % [4].

У Маладзечанскай вобласці па стане на 15.01.1950 г. было 1138 калгасаў і працэнт калектывізацыі складаў 39,4 %. А ўжо ў студзені

1951 года на тэрыторыі Маладзечанскай вобласці знаходзілася 1607 калектыўных гаспадарак, а працэнт калектывізацыі склаў 87,3 % [4].

У лютым 1951 года партыйным органам была пастаўлена задача завяршыць калектывізацыю, палітычна і арганізацыйна-гаспадарча ўмацаваць калгасы. Была зроблена ўстаноўка – скончыць калектывізацыю за 2–3 месяцы [56, с. 110]. Пагэтаму калектывізацыя працягвалася. Працэнт калектывізацыі паступова рос. У лютым 1951 года ён складаў 84,8%, а ў лістападзе гэта года – 89,7 % [6].

У Маладзечанскай вобласці калектывізацыя ў 1951 года праходзіла без адметнасцяў. Па стане на 15.01.1951 г. было створана 1607 калгасаў і працэнт калектывізацыі склаў 87,3 %, а ўжо праз год, на дадзеных на 01.01.1952 г. у Маладзечанскай вобласці налічвалася 1228 калгасаў і працэнт калектывізацыі склаў 92,7 % [6].

Адначасова з калектывізацыяй працягваўся працэс узбуйнення раней арганізаваных дробных калгасаў. Згодна з пастановай ЦК ВКП(б) ад 30.05.1949 г. «Аб узбуйненні дробных калгасаў і задачах партыйных арганізацый у гэтай справе» афіцыйна было абвешчана, што дробныя калгасы не могуць эфектыўна ўкараняць новую тэхніку і тэхналогію [56]. Больш за 2200 дробных калгасаў у 1949–1951 гг. былі аб'яднаны ў 599 узбуйненых калгасаў [60].

У 1951 годзе асноўны ўпор быў зроблены на ўзбуйненне калгасаў. Пра гэта сведчаць статыстычныя дадзеныя. Калі ў студзені 1951 года ў заходніх абласцях БССР налічвалася 6054 калгасы, то ўжо ў лістападзе 1951 года было 4568 калгасаў [34, малюнак 3.3, малюнак 3.4], а ў студзені 1952 года – 4384 калгасы [11].

У верасні 1952 г. на ХХ з’ездзе КП(б)Б былі падведзены вынікі калектывізацыі ў заходніх абласцях БССР. Партыйным кіраўніцтвам было канстатавана, што калектывізацыя ў заходніх абласцях БССР завершана. Адзначалася, што такі вынік – сур'ёзная палітычная перамога, важнейшы паказчык дзейнасці партыйных арганізацый у вёсцы [4, с. 126].

Па стане на 1953 г. у заходніх абласцях БССР былі створаны 2705 калгасных гаспадаркі, 43 саўгасы, якія аб'ядноўвалі 520900 сялянскіх двароў, 99.7 % пасяўных плошчаў [4, с. 127].

У азначаны перыяд узмацнілася агітацыя сялян па стварэнню калгасаў, пачаўся больш шырокі наступ на кулакоў, што абумаўлівалася павялічэннем падаткаў і высылкай ў Казахстан найбольш нязгодных з палітыкай партыі. Тэмпы росту калектыўных гаспадарак у 1949–1952 гадах былі вельмі высокімі. Уступалі цэлымі вёскамі, у архівах захоўваюцца дадзеныя сялянскіх сходаў, на якіх прымалі рашэнні аб

стварэнні калгасаў. Аднак, даволі часта калгас стваралі і ён заставаўся на паперы, бо не было вялікай кааперацыі і абагульнення жывёлы, прылад працы, зямель. Таксама ўступленне ў калгасы было фарсіраваным з выкарыстаннем прымусу і рэпрэсій.

У выніку патрэбна адзначыць, што другі этап калектывізацыі ў заходніх абласцях БССР (1949–1953 гг.) характарызаваўся правядзеннем масавай калектывізацыі і ўзбуйненнем калгасаў. Можна адзначыць, што ў 1949–1950 гг. больш увагі надавалася пабудове калгасаў, а ўжо ў 1951–52 гг. іх развіццю, станаўленню і ўдасканаленню. У верасні 1952 года калектывізацыя была завершана. У 1953 годзе на пярэдні план выйшлі пытанні ўжо не пабудовы калгасаў, а перавыканання плана, арганізацыі сацыялістычных спаборніцтваў, узняцця ўзроўню жыцця грамадзян.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Белязо Е. П.* Крестьянство Белоруссии на пути к развитому социализму. Мн.: Навука і тэхніка, 1982 г.
2. Стенограмма совещания по вопросу колхозного строительства в западных областях Белоруссии от 21.10.1948 // НАРБ. Ф. 4п. Оп. 29. Д. 623. Л. 48–210.
3. Сведения о ходе коллективизации и колхозном строительстве в западных областях БССР на 15 декабря 1949 г.// НАРБ. Ф. 4п. Оп. 46. Д. 398. Л. 69–103.
4. Из докладной записки представителя Совета по делам колхозов при правительстве СССР по БССР Р. Мачульского председателю Совета по делам колхозов при правительстве СССР А. А. Андрееву об организационно-хозяйственном состоянии колхозов западных областей БССР от 09. 09. 1949// НАРБ. Ф. 4п. Оп. 62. Д. 22. Л. 61–82.
5. Сведения о ходе коллективизации в западных областях БССР в 1950 году // НАРБ. Ф. 4п. Оп. 46. Д. 444. Л. 218.
6. *Смяховіч М. У.* Сельская гаспадарка Беларусі ў 1943–1991 гг: этапы развіцця, дасягенні, вопыт: НАН, Інст-т гісторыі. Мінск: Беларуская навука, 2017.
7. Справка о количестве колхозов имеющихся в БССР на 01 декабря 1946 года // НАРБ. Ф. 4п. Оп. 46. Д. 212. Л. 87.
8. О помощи западным областям в наведении порядка в землепользовании новых колхозов. Товарищу Красикову от Министра сельского хозяйства БССР С. Костюка от 4.07.1949// НАРБ. Ф. 4п. Оп. 46. Д. 390. Л. 199–203.
9. Информация министерства сельского хозяйства БССР о ходе коллективизации в западных областях БССР от 01.01.1952 г.// НАРБ. Ф. 4п. Оп. 46. Д. 564. Л. 68.
10. Информация о ходе коллективизации в Западных областях БССР в 1951 году / Сведения Министерства сельского хозяйства БССР о ходе коллективизации в Западных областях БССР// НАРБ. Ф. 4п. Оп. 46. Д. 488. Л. 2–197.
11. Информация о ходе коллективизации в Западных областях БССР в 1952 году / Сведения Министерства сельского хозяйства БССР о ходе коллективизации в Западных областях БССР// НАРБ. Ф. 4п. Оп. 46. Д. 564. Л. 68.